Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

22 сьнежня 1931 г. № 287 (1562)

Чырвоная Зьмена

Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ

Шэфства абавязвае

На энергетычным фронце трывога. На галодны паёк пакінуты дзесяткі фабрык і заводаў Савецкай Беларусі.

Разгорнутае соцыялістычнае будаўніцтва, пуск у БССР многіх з 51, новыя корпусы фабрык і заводаў, новае абсталяваньне прад'яўляюць электрычнай прамысловасьці вялікія запатрабаваньні.

Значныя запатрабаваньні прад'яўляе культурная рэволюцыя і пасьлядоўнае палепшаньне культурна-бытавых умоў жыцьця рабочых і працоўнага сялянства. Як рабочыя, так і калгасьнікі не жадаюць больш жыць пры газоўцы. Яны патрабуюць электрычнага асьвятленьня, яны патрабуюць укараненьня электрычнасьці ў быт з тым, каб яно прыйшло на перабудове быту.

Электрычнасьці належыць не толькі наша будучыня, але і наша сёньня. Электрычная прамысловасьць дыктатуры пролетарыяту значна расла. Мы пусьцілі ў ход [illegible]етан і намецілі вялікае будаўніцтва надалей.

А зараз на энергетычным фронце трывога. З кожным днём адчуваецца ўсё больш і больш энергетычны голад. Энэргетычная прамысловасьць не пасьпявае ў сваім росьце з тымі запатрабаваньнямі, якія перад ёю паўстаюць. Дрэнна працуе Белдрэс імя Сталіна. Ён не дае патрэбнай колькасьці энэргіі прамысловасьці Віцебску, Магілёва і іншых прамысловых раёнаў. Са значнымі перабоямі працуе Менскі Эльвод.

У выніку—сотні тысяч рублёў страты, значныя ўдары па выкананьні прамфінпляну.

Якім прычына, хто вінаваты ў гэтым? Пры ўсёй перагрузцы Белдрэс дрэнная арганізацыя работ, абязьлічка і ўраўнілаўка пануюць у яго працы. Асноўная прычына дрэннай работы Белдрэсу караніцца ў нежыцьцяўленьні ўказаньняў т. Сталіна, нежаданьні перабудаваць сваю работу адпаведна з новымі задачамі.

Значна адбіваецца на працы электростанцыі нізкая якасьць торпу і слабая яго вывазка. Замест нормальных 30 проц. торп дасылаецца на Эльвод з значна большым процантам вільгаці.

Месячнік штурму вывазкі торпу разгорнут слаба. Так, Асінторп за 4 квартал павінен вывезьці 24833,0 тон торпу, а вывезена з 1-га кастрычніка па 15 сьнежня толькі 19772,6 тон. Гэта ў той час, калі запасы торпу складаюць астачу ў 47460,9 тон торпу.

Гэта па аднаму Асінторпу. Па раду заводаў, як імя Даўмана, „Чырвоны сьцяг“, Міханавічы, „Пролетары“, „Бальшавік“ і г. д., вывазка і да гэтага часу не наладжана.

ЛКСМБ дрэнна спраўляецца са сваёй задачай шэфа электрыфікацыі. Комсамольскія ячэйкі як торпзаводаў, так і электростанцый не атрымоўваюць яшчэ сталага сыстэматычнага кіраўніцтва, выходзячы з конкрэтных умоў данага прадпрыемства.

Чаго варты той факт, што Шклоўскі торпзавод „Вольніца“, дзе працуе шмат комсамольцаў і рабочае моладзі, да гэтага часу не вывез ніводнае тоны торпу, тым часам як каля 900 тон ляжаць яшчэ зусім ня кранутыя.

Ня гледзячы на дрэнную работу заводу, РК комсамолу не зьвяртае на яго увагі, да гэтага часу ня створана комсамольская ячэйка.

Шэф электрыфікацыі ў адказе за работу электрычнай прамысловасьці. Энэргетычная прамысловасьць можа і павінна працаваць лепш! Для гэтага ёсьць усе магчымасьці.

Неабходна ў кароткі перабудаваць усю работу станцый па групе 6 ўказаньняў т. Сталіна і надаць ударныя тэмпы месячніку вывазкі торпу.

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на працу энергетычных ячэек фабрык і заводаў. На большасьці прадпрыемстваў энергетычныя ячэйкі ня створаны, а там дзе і створаны —працуюць досыць дрэнна.

Мы барбарскі адносімся да выдаткаваньня электрычнасьці. Электрычнасьць вельмі часта круціць у халастую трансмісіі і моторы. Часта, вельмі часта, зусім дарэмна губіцца сьвятло.

На энергетычным фронце прарыў ЛКСМБ і ў першую чаргу аршанская і мінская організацыі павінны мобілізавацца на ліквідацыю прарыву, выкрыць усе карэньні яго і на базе ўказаньняў т. Сталіна дабіцца пераломч, зьняць з галоднага пайка фабрыкі і заводы Савецкай Беларусі!

Пошага студзеня—„дзень ударніка“

(Пастанова прэзыдыуму ЦСПСБ і ВСНГ)

Да рэалізацыі пастановы сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб правядзеньні падрыхтучай работы да „дню ўдарніцтва“ (1-га студзеня 1932 году) і мобілізацыі рабочых мас прадпрыемстваў і чыгункі на ажыцьцяўленьне рашэньня Кастрычнікавага пленуму ЦК УсеКП(б) і лістападаўскага пленуму ЦК КП(б)Б, прэзыдыум ЦСПСБ і ВСНГ Б прапануе:

1. УсіЦП саюзаў, райпрофсаветам, ФЗМК і гаспадарчым аб'яднаньням падахоць усю работу па правядзеньню эстафеце „4 год пяцігодкі“ і сталінскую задачу, якія ставілі сабе мэтай праверыць выкананьне 6 умоў, высунутых у прамове т. Сталіна, для забясьпячэньня безумоўнага выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну 3-га рашаючага году і падрыхтоўкі да сустрэчы 4-га, заключнага году пяцігодкі. Трэба дабіцца далейшага ўзняцьця шырокіх мас у сацспаборніцтва і ўдарніцтва з у яго вышэйшых формах узмацніць існуючыя, арганізаваць новыя гаспадарча-разрахунковыя брыгады і ўкараніць зьменна-сустрэчнае плянаваньне, каб гэтым забясьпечыць поўнае выкананьне і перавыкананьне паказчыкаў пляну, пачынаючы з 1-га кварталу 1932 году.

2. Да прапарыву зьніжэньня правесьці зьлёты ўдарнікаў па ўсіх прадпрыемствах і чыгунцы, з прэміяваньнем у час зьлёту лепшых рабочых ударнікаў. Зьлёты ўдарнікаў павінны правесьці пад лозунгам выкананьня прамфінпляну, асабліва ў якасных паказчыках.

3. Гарпрофсаветам правесьці зьлёты ўдарнікаў наступным парадкам: г. Менску, Віцебску, Гомелі, Магілёва, Бабруйску, Барысава і Ворша на працягу сьнежня. Правесьці гарадзкія зьлёты ўдарнікаў.

4. Правесьці ўсебеларускія зьлёты ўдарнікаў наступным ЦП саюзаў аб'яднаньнем.

Лесдрэўзлучэньне правесьці ў Гомелі 23 сьнежня зьлёт ударнікаў за[...] прамысловасьці, 27 сьнежня зьлёт ударнікаў лесапрацягаў, 27 [...] Правесьці ўсебеларускі зьлёт ударнікаў [...] Вабску 28-XII-31 г.

МТС і батракоў—правесьці ўсебеларускі зьлёт ударнікаў МТСу г. Бабруйску.

Гарбароў—правесьці ўсебеларускі зьлёт ударнікаў у г. Магілеве на працягу з 27-XII-31 г. па 3-1-32.

Машынабудаўнікоў—правесьці ўсебеларускі зьлёт ударнікаў у Менску 27-28-XII-31 г.

Модус прадстаўніцтва ўстанаўліваецца ЦП саюзу разам з адпаведнымі гаспадарчымі арганізацыямі.

5. За час правядзеньня ўсебеларускіх зьлётаў зарплата дэлегатам зьлёту захоўваецца прадпрыемствам, астатнія выдаткі правядзеньня іх за кошт сродкаў адпаведнай гаспадаркі, так і профарганізацый.

І. Сталін аб ВЧК—АДПУ

5-га лістапада 1927 г. т. Сталін меў гутарку з замежнымі рабочымі дэлегацыямі. У гутарцы прынялі ўдзел 80 дэлегатаў з Нямеччыны, Францыі, Аўстрыі, Чэха-Славакіі, Паўночнай Амэрыкі, Кітаю, Бэльгіі, Фінляндыі, Даніі і Эстоніі. У ліку іншых пытаньняў, заданых замежнымі рабочымі дэлегацыямі т. Сталіну, было пытаньне ад АДПУ. Ніжэй мы зьмяшчаем адказ т. Сталіна на гэтае запытаньне.

АДПУ, альбо ВЧК, ёсьць карны орган савецкае ўлады. Гэты орган больш ці менш аналёгічны камітэту грамадзкай бясьпечнасьці, які быў складзен у часе вялікай французкай рэволюцыі. Ён карае галоўным чынам шпіёнаў, загаворшчыкаў, тэрорыстых, бандытаў, спэкулянтаў, фальшываманэтчыкаў. Ён уяўляе сабою нешта накшталт ваенна-політычнага трыбуналу, створанага для аховы інтарэсаў рэволюцыі ад замахаў з боку контррэволюцыйных буржуа і іх агентаў.

Гэты орган быў складзен на другі дзень пасьля Кастрычнікавай рэволюцыі, пасьля таго, як выявіліся ўсякія загаворшчыцкія, тэрорыстычныя і шпіёнскія організацыі, якія фінансаваліся расійскімі і замежнымі капіталістымі. Гэты орган разьвіўся і ўмацаваўся пасьля раду тэрорыстычных актаў супроць дзеячоў савецкай улады, пасьля забойства т. Урыцкага, члена рэволюцыйнага камітэту ў Ленінградзе (ён быў забіты эсэрам), пасьля забойства тав. Валадарскага, члена рэволюцыйнага камітэту ў Ленінградзе (ён быў забіты таксама эсэрам), пасьля замаху на жыцьцё Леніна (ён быў паранены членам партыі эсэраў). Трэба прызнаць, што АДПУ тады наносіла ўдары ворагам рэволюцыі метка і бяз промаху. Гэта якасьць захавалася за АДПУ і па сёньняшні дзень. З таго часу АДПУ зьяўляецца гразой буржуазіі, няўсыпным вартавым рэволюцыі, аголеным мечам пролетарыяту.

Ня дзіва таму, што буржуазія ўсіх краін мае да АДПУ жывёльную нянавісьць. Няма такіх легенд, якія-б не складаліся пра АДПУ. Няма такой хлусьні, якую-б не распаўсюджвалі пра АДПУ. А што гэта значыць? Гэта значыць, што АДПУ правільна абараняе інтарэсы рэволюцыі. Заклятыя ворагі рэволюцыі лаюць АДПУ, значыцца — АДПУ дзейнічае правільна.

Ня так адносяцца да АДПУ рабочыя. Пахадзеце па рабочых раёнах і спытайце рабочых пра АДПУ. Вы ўбачыце, што яны адносяцца да яго з павагай. Чаму? Таму, што яны бачаць у ім вернага абаронцу рэволюцыі.

Я разумею нянавісьць і недавер'е буржуа к АДПУ. Я разумею ровных буржуазных вандроўцаў, якія, прыяжджаючы ў СССР, першым чынам спраўляюцца аб тым, ці жыве яшчэ АДПУ і ці не наступіў час для ліквідацыі АДПУ. Усё гэта зразумела і ня дзіўна.

Але я адмаўляюся зразумець некаторых рабочых дэлегатаў, якія, прыяжджаючы ў СССР, з трывогай пытаюць: ці шмат контррэволюцыянэраў пакарана АДПУ, ці будуць яшчэ караць розных тэрорыстых і загаворшчыкаў супроць пролетарскае ўлады, ці ня час спыніць існаваньне АДПУ? Адкуль толькі бяруцца ў некаторых рабочых дэлегатаў гэтыя клопаты аб ворагах пролетарскай рэволюцыі? Чым іх вытлумачыць? Як іх абаснаваць?

Прапаведваюць максімальную мяккасьць раяць зьнішчыць АДПУ... Ну, а ці можна паручыцца, што пасьля зьнішчэньня АДПУ, капіталістыя ўсіх краін адмовяцца ад організацыі і фінансаваньня контррэволюцыйных груп загаворшчыкаў, тэрорыстых, падпальшчыкаў, узрыўшчыкаў? Разброіць рэволюцыю, ня маючы ніякіх гарантый на тое, што ворагі рэволюцыі будуць разброены,—ну, ці-ж гэта ня глупства? Ці-ж гэта не злачынства супроць рабочае клясы? Не, таварышы, мы не жадаем паўтарыць памылкі парыскіх комунараў. Парыскія комунары былі занадта мяккія ў адносінах вэрсальцаў, за што іх з поўнай падставаю лаяў у свой час Маркс. А за сваю мяккасьць яны добра паплаціліся тым, што калі Т'ер увашоў у Парыж, дзесяткі тысяч рабочых былі расстраляны вэрсальцамі. Ці ня думаюць таварышы, што рускія буржуа і абшарнікі менш крыважэрны, чым вэрсальцы ва Францыі? Мы ведаем, ва ўсякім выпадку, як яны распраўляліся з рабочымі, калі займалі Сібір, Украіну, Паўночны Каўказ у саюзе з французскімі, ангельскімі, японскімі і амэрыканскімі інтэрвэнцыяністымі.

Я гэтым зусім не хачу сказаць, што ўнутраное становішча краіны, якое абавязвае нас мець карныя органы рэволюцыі, з пункту погляду ўнутранога стану рэволюцыі, да таго моцна і непахісна, што можна было-б абыйсьціся без АДПУ. Але справа ў тым, што ўнутраныя ворагі не зьяўляюцца ў нас ізоляванымі адзінкамі. Справа ў тым, што яны зьвязаны тысячамі ніцей з капіталістымі ўсіх краін, якія падтрымліваюць іх усімі сіламі, усімі сродкамі. Мы—краіна, акружаная капіталістычнымі дзяржавамі. Унутраныя ворагі нашай рэволюцыі зьяўляюцца агентурай капіталістых усіх краін. Капіталістычныя дзяржавы ўяўляюць базу і тыл для ўнутраных ворагаў нашай рэволюцыі. Ваюючы з унутранымі ворагамі, мы вядзем, стала быць барацьбу з контррэволюцыйнымі элемантамі ўсіх краін. Судзеце зараз самі, ці можна абыйсьціся пры гэтых умовах бяз карных органаў, як АДПУ?

Не, таварышы, мы ня хочам паўтарыць памылкі парыскіх комунараў, АДПУ патрэбна рэволюцыі і АДПУ будзе жыць у нас на страх ворагам пролетарыяту.

(Бурныя аплёдысмэнты).

Напярэдадні IV пленуму ЦК ЛКСМБ

Рыхтуйце рапарты перамог

Да пленуму ЦК забясьпечым круты пералом у рэалізацыі пастаноў партыі аб школе

Агляд барацьбы за школу

З пастановы нарады заг. аддзелу адукацыі і культуры РК ЛКСМБ аб ходзе рэалізацыі пастаноў ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б аб школе і падрыхтоўцы да пленуму ЦК)*

Нарада адзначае, што комсамольскія організацыі яшчэ не падыйшлі шчыльна да рэалізацыі пастаноў партыі аб школе і не скарысталі (за выключэньнем асобных організацый) прадпленумаўскага перыоду для мобілізацыі ўвагі комсамольскай і піонэрскай організацыі на палепшаньне становішча школ. Улічваючы такое становішча з рэалізацыяй пастаноў ЦК аб школе, улічваючы наяўнасьць прарываў ва ўсеабучу, нарада лічыць неабходным ужыць наступныя мерапрыемствы:

—Для лепшай мобілізацыі грамадзкасьці вакол рэалізацыі пастаноў ЦК аб школе з 15 сьнежня абвясьціць агляд барацьбы комсамолу за рэалізацыю пастаноў партыі аб школе. Гэты агляд правесьці на старонках „Чырвонай зьмены“, „Юнгер Арбэйтэр“, і „Піонэр Беларусі“ і старонках райгазэт, насьценгазэт, шматтыражак. Адказнасьць за правядзеньне агляду ўскласьці на камітэты ЛКСМБ. Падтрымаць ініцыятыву Менгаркомолу аб правядзеньні конкурсу на лепшую школу. Раіць усім РК правесьці такі конкурс і на гэтай аснове ператварыць яго ва ўсебеларускі.

—Наяўнасьць прарываў у правядзеньні ўсеабучу (процант ахопу ніжэй мінулагодняга, недахоп тысячы настаўнікаў па БССР) патрабуе ад комсамольскіх організацый ўжыцьця неадкладных конкрэтных захадаў па ліквідацыі гэтых прарываў. Камітэтам і ячэйкам неабходна разгарнуць баявую работу па 100 проц. ахопу дзяцей, падлягаючых усеабучу шляхам правядзеньня належнай масавай работы (сходы бацькоў, падвоз далёка пражываючых вучняў). Пры правядзеньні гэтай работы неабходна весьці барацьбу з адсевам. Уключыцца ў 2-хдэкаднік штурму прарываў ва ўсеабучы, праводзімы НК Асьветы з 5 па 25 сьнежня. Камітэтам і ячэйкам забясьпечыць неабходны ўдзел у гэтым 2-хдэкадніку.

—Для ліквідацыі прарыву з забясьпечаньнем настаўніцтва нарада выказваецца за неабходнасьць мобілізацыі 200 комсамольцаў, маючых сярэднюю адукацыю на пэдработу непасрэдна ў школе. Камітэтам у 10-цідзённы тэрмін зьвярнуць у школы ўсіх комсамольцаў-настаўнікаў, працуючых на іншай рабоце для ўзмацненьня кадрамі органаў Нарасьветы. Накіраваць для работы ў аддзелы нарасьветы ў якасьці інструктароў 30 лепшых комсамольцаў-пэдагогаў. Накіраваць на работу ў школу 50 комсамольцаў скончыўшых ФЗВ у якасьці інструктароў, і гэтую мобілізацыю скончыць не пазьней 1-га студзеня 1932 г.

—Констатуючы нездавальняючае выкананьне дырэктыў партыі па організацыі майстэрань і рабочых пакояў пры школах, лічыць неабходным узяць непасрэдны кантроль з боку ячэек і камітэтаў над організацыяй майстэрань і рабочых пакояў. З 20 па 30 сьнежня правесьці ўсебеларускі суботнік у дапамогу школе, ставячы сабе галоўнай мэтай у час суботніку організацыю майстэрань і рабочых пакояў, збор і перадачу абсталяваньня майстэрням. Піонэр-організацыі і школьнікі, уключаючыся ў гэты суботнік, павінны сабе паставіць мэту палепшаньне дабрабыту школ, забесьпячэньне апалам асьвятленьнем. Комсамольскім організацыям разгарнуць падрыхтоўку да правядзеньня ўсесаюзнага суботніку ў карысьць школы, які будзе праводзіцца 21 студня—у дзень Леніна.

—Для праверкі выкананьня дырэктыў партыі аб забесьпячэньні настаўніцтва, лічыць неабходным 28 сьнежня правесьці ўсебеларускі налёт лёгкай кавалерыі на ўсе ўстановы, якія зьвязаны з забесьпячэньнем настаўніцтва. Матар'ял выяўленых злачынстваў, недахопаў у гэтай справе перадаць у органы КК-РСІ і дабіцца конкрэтнага рэагаваньня і прыняцьця неабходных захадаў.

—Комсамольскім організацыям сумесна з органамі нарасьветы узмацніць работу па організацыі ўзорных школ, улічваючы вопыт Полацкай, Віцебскай, Менскай організацый у гэтай галіне. Комсамольскім організацыям шляхам прыняцьця неабходных мерапрыемстваў усямерна ўзмацніць работу ўжо існуючых узорных школ.

—Адзначаючы, што ход перагляду і выпраўленьня програм незабясьпечвае выкананьня дырэктыў ЦК КП(б)Б аб сканчэньні гэтай работы да 1 студзеня 1932 г. лічыць неабходным, каб з боку НК Асьветы былі ўжыты неабходныя меры для ўзмацненьня гэтай работы. Менгаркому вылучыць групу комсамольцаў-асьпірантаў (20 чал.) у дапамогу НКА ў правядзеньні гэтай работы.

—Нягледзячы на неаднаразовыя дырэктывы аб узмоцненьні работы і кіраўніцтва маладымі настаўнікамі і настаўнікамі-комсамольцамі неабходнага зруху ў гэтым напрамку яшчэ няма. Таму ўвесьці ў сыстэму работы камітэтаў скліканьне пэрыодычнай нарады комсамольцаў-настаўнікаў.

*) Пастанова зацьверджана сэкратарыятам ЦК ЛКСМБ.

Ня спыняць конвэер барацьбы за лён

БЯЗЬЛІТАСНА БІЦЬ ПА ПРАКТЫЦЫ „ЧАРГОВАСЬЦІ" КАМПАНІЙ

Штурмавы месячнік апрацоўкі і загатоўкі лёну скончыўся. Рад раёнаў (Дрысенскі, Расонскі, Мсьціслаўскі, Буда-Кашалеўскі), якія па-бальшавіцку змагаліся за лён, за гэты час дасягнулі значных посьпехаў. Але, побач з перадавымі, рад раёнаў ганебна пляцецца ў хвасьце ільназагатовак. У Сіроцінскім, Дубровенскім, Полацкім, Барысаўскім і Бягомльскім раёнах на 15 сьнежня процант выкананьня хістаецца ад 15-30.

Сёньня зьмешчаны мат'ял сьведчыць аб тым, што рад комсамольскіх організацый яшчэ не ўяўляе сабе важнасьці ільназагатовак, не мобілізаваў мас на выкананьне плянаў.

Разьбіўшы кулацка-месьніцкую практыку і тэндэнцыю аб „чарговасьці кампаній", комсамол павінен прыняць усе захады да ліквідацыі вузкіх месц у ільназагатоўках.

Перадавыя, бярэце на буксір адстаючых

Зарочна-Шклоўскі с-с выканаў 110 проц. загатоўкі лёну

Шклоў. За апошні час Шклоўскі РК КСМ значна зьнізіў тэмпы па мобілізацыі комсамолі на ільназагатоўкі, а адсюль і нізкія паказчыкі ў выкананьні плянаў.

Заданьне на 4400 цэнтн. ільнавалакна выканана на 47 проц., на 36480 цэнтн. ільнатрасты выканана на 27 проц., ільнасаломкі здана 2574 цэнтн, альбо 14 проц. заданьня.

Рад сельскіх саветаў і партыйна-комсамольскіх ячэек сваёй праваопортуністычнай бязьдзейнасьцю зрываюць апрацоўку і здачу ільна валакна. Каменалаўскі с-савет плян па ільнавалакну выканаў на 19 проц. Падгайцаўскі—21 проц. Еганаўскі—22 проц. і г. д. У колгасах гэтых с-саветаў не наладжана як сьлед ударная апрацоўка лёну, ня ўведзена прогрэсыўна-прэміяльная зьдзельшчына, не разгорнута соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Комсамольскія ячэйкі гэтых с-саветаў сталі ў баку ад ільназагатовак.

Некаторыя с-саветы набліжаюцца да выкананьня сваіх плянаў. Загаранскі с-савет, шырока разгарнуўшы соцспаборніцтва і ўдарніцтва ў колгасах, увёўшы прогрэсыўна-прэміяльную зьдзельшчыну, дабіўся выкананьня плянаў па ільнавалакну—на 76 проц., Аляксандраўскі—91 проц., Гарадоцкі па ільнасаломцы 75, Зарэчна-Шклоўскі—110.

Партыйна-комсамольскія організацыі гэтых перадавых с-саветаў здолелі ауладаць тэхнікай барацьбы за лён і гэтым самым дабіцца бальшавіцкіх посьпехаў. Але-ж ні райколгассаюз, ні РВК, ні РК КСМ ня прынялі належных мер, каб распаўсюдзіць вопыт перадавых сельсаветаў і колгасаў на ўвесь раён.

Комсамол Шклоўшчыны павінен зрабіць усё, каб, скарыстаўшы вопыт перадавых с-саветаў і колгасаў, плян ільнанарыхтовак выканаць поўнасьцю і ў тэрмін.

Юр. Загорскі.

У авангардзе барацьбы за лён

ДУБРОЎНА. (Белта). Колгасы „Дняпроўскае набярэжжа", „Савецкая Беларусь", „Да соцыялізму" і „Ленінскі прамень" Чарнаручанскага сельсавету поўнасьцю выканалі плян ільназагатовак. Зараз колгасы ўзялі на грамадзкі буксір аднаасобнікаў вёсак Якіменка, Сеньцоры і Шарбіна, якія з дапамогай колгасьнікаў канчаюць загатоўку лёну.

„Перш [illegible] а потым дзяржаве"

Д[illegible] адпор кулацка-месьніцкай практыцы

Колгас „Спартак" Фаліцкаўскага с-савету Шклоўскага р-ну на ўключыўся ў штурмавы месячнік апрацоўкі і здачы ільнавалакна дзяржаве. За месяц здадзена ільнатрасты 3, 5 тоны, а ільнавалакна—ніводнага кіло. Зьдзельшчына ў апрацоўцы лёну ня ўжываецца, у выніку—дна лазьня лёну сушыцца 4 дні. Ня складзены брыгады на апрацоўцы.

Сярод колгасьнікаў ёсьць кулацкая тэндэнцыя: „перш размеркаваць лён паміж колгасьнікаў, а потым здаваць лішкі дзяржаве". Праўленьне колгасу і комсамольская ячэйка не далі рашучага адпору кулацка-месьніцкай практыцы.

Ю. З.

Выжыць практыку „чарговасьці кампаній"

Месячнік барацьбы за лён, які праводзіўся Слуцкай райорганізацыяй, закончыўся, але-ж належнага пералому ў апрацоўцы і здачы ільнавалакна дзяржаве не дасягнута. Слутчына выканала свой гадовы плян загатовак ільнавалакна к 15 сьнежня на 14,7 проц., ільнанасеньня—на 61 проц.

Гэтыя лічбы сьведчаць аб опортуністычнай недаацэнцы пасобнымі сельсаветамі і комсамольцамі гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі. Болідкі, Дарасінскі і Грэскі сельсаветы апрацоўку і загатоўку лёну пусьцілі на самацёк.

У колгасе „Чырвоны маяк № 2" з-за бязьдзейнасьці праўленьня да апошняга часу лён ляжаў неапрацаваным. Па радзе колгасаў усё яшчэ не выкарчавана опортуністычная практыка чарговасьці кампаній: „перш выканаць збожжазагатоўкі, а потым узяцца за лён".

Зусім недапушчальна спаганяюцца цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак. Спагнана усяго 14 проц.

Брыгадзір „Ч. З." Канончык.

Колгас „Сталінец"—злосны зрыўшчык лёна загатовак

Капыль. Колгас „Сталінец" пра здачу дзяржаве ільнавалакна ня думае. Падабраны лён ляжыць у цуні неапрацаваным. Комсамольская ячэйка і праўленьне колгасу ня прымаюць мер, каб як найхутчэй апрацаваць і здаць дзяржаве ільнавалакно.

РК КСМ і РСІ павінны прыцягнуць да суровай адказнасьці зрыўшчыкаў ільнанарыхтовак.

Колгас „Сталінец" павінен выканаць свае абавязкі перад дзяржавай.

Юнкор „Чырвонай зьмены" Алесь Бахта.

К бальшавіцкай вясьне рыхтаваць здаровага каня

Ліквідаваць абязьлічку ў цягавай сі[лы]

Даць рашучы бой кулацкай агітацыі за зрыў канягадоўлі

Роля каня ў народнай гаспадарцы вялізарная.

У правільным злучэньні конскай цягавай сілы і трактара выраштлiся посьпехі вясеньняй і асеньняй пасеўных кампаній. Таму зусім недапушчальна паслабленьне ўвагі раду колгасаў і саўгасаў да каня. Трэба цьвёрда памятаць, што мэханізацыя сельскай гаспадаркі, падвядзеньне пад яе моцнай тэхнічнай базы хаця і зьяўляецца рашаючай умовай у стварэньні высокатаварнай, высокаўраджайнай колектыўнай гаспадаркі, аднак ніяк не зьнімае адказнасьці за праяўленьне клопатаў да жывой цягі колгасаў.

Тым ня менш, у радзе месц разбазарваюць коняй, па-драпежніцку адносяцца да жывёлы. Вось факт.

Старшыня колгасу „Чырвоны май № 1" (Валешыцкі сельсавет. Капыльскага раёну) загадаў конюхам загнаць 30 коняй у адно халоднае памяшканьне. „Загад" быў выканан, і коні прастаялі 5-6 дзён без корму. У колгасе „Прабуджэньне" (Станькаўскі с.-с.. Койданаўскі раён) добрыя заводзкія коні з прычыны абязьлічкі ў доглядзе сталі нягоднымі. Тут-жа 20 жарабят не выпускаліся на двор з цёмнай бруднай стайні, дравна карміліся. У выніку 7 жарабят здана на бойню. Бабаўнянскае сельцо, Капыльскага раёну, прымае ўвесь час коняй без адпаведных актаў бракоўкі. Выконваючы пляны загатовак скурсыравіны, сельпо забівае малалых, здаровых коняй. У адным толькі колгасе „Завацьце" забіта 16 галоў.

Кулак і тут зыграў сваю ролю. [illegible] ўцяміў што без конскай [illegible] сілы нельга цяпер разьвіваць соцыялістычную гаспадарку, і вядзе шкодніцкую работу за разбазарваньне і збыт коняй за бясцэнак. Савецкая грамадзкасьць ня ўсюды як сьлед мабілізавана на барацьбу за поўнае захаваньне конскай цягавай сілы.

Інтарэсы абароны краіны та[кжа] патрабуюць максімум увагі [да] каня.

Комсамольскія ячэйкі па[вінны] разьвіваць самадзейнасьць і і[ні]цыятыву ў барацьбе за добрага [кон]гаснага каня, сконцэнтраваўшы сваю ўвагу вакол наступных [прак]тычных мерапрыемстваў.

Па-першае, давесьці да ко[жнага] рабочага саўгасу, колгасьніка, асобніка бедняка і серадняка [пас]тановы СНК БССР аб мерах [пала]ніцьця каняводства, паст[анову] ЦВК і СНК СССР аб мерах су[праць] забою коняй, рашуча змагацца з выпадкамі разбазарваньня і [дра]пежніцкіх адносін да каня. [На] канягадоўчых фэрмах, ва ўсіх [кол]гасах і саўгасах ліквідаваць а[бязь]лічку, ўкараніць сапраўдную зьдзельшчыну. Працу ацэньваць толькі адной кольказасьцю дзён слугоўваньня стайні, а ўвесьці сыстэму праміяльнае наліч[эньне] працадзён за добры стан [каня] як конюху, так і прымацаванаму колгасьніку.

Па-другое, організаваць зі[мовае] коням. Закончыць будаўні[цтва,] рамонт і ацяпленьне стаень. [Вы]лучаць кармовы фонд асобна [на] вясеньнюю пасеўную камп[анію] пасьля поўнага выкананьня п[ляну] збожжазагатовак. Жорстка бі[ць] тых хто глуміць і разбаз[арвае] кармы.

Павесьці масава-паліт[ычную] працу сярод колгасьнікаў за выдзяленьне лепшага каня у [фонд] абароны.

ЦКК РСІ праводзіць рэйд [пра]веркі стану каняводства. Ком[са]мольскія ячэйкі, юнкоры абавязаны ўключыцца ў рэйд, практычнымі мерапрыемствамі змагацца за [доб]рага колгаснага каня, узмацняць гэтым гаспадарчую моц колгас[аў].

П-Ч [illegible]

Прыехалі

А. Прокофскі

Ліст з Лейпцыга

Паліцыя іх не сустракала—яны-ж не прадстаўнікі фашысцкай Італіі, як Грандзі, і не прадстаўнік французскага імпэрыялізму—як Лаваль і Брыян. Яны не міністры, не банкіры, не паліцэй-прэзыдэнты. Тых сустракала ўся „нацыя" г. зн. уся буржуазна-фашысцкая Нямеччына. Калі яны езьдзяць па Нямеччыне, рэйкі чыгунак старанна аглядаюцца чыгуначнай паліцыяй. На станцыях „гуляюць" шпікі, вакзалы акружаны паліцыяй і „масы"—адурачаныя мяшчане і буржуазія ў захапленьні крычаць ура.

Яны—дэлегацыя рабочае моладзі Нямеччыны (Саксоніі), якая звароччваецца з Савецкай Беларусі, з чырвонай Масквы—прадстаўнікі сёньня яшчэ ў Нямеччыне зьняволенае клясы, а ў СССР вольнага будаўніка соцыялізму—пролетарыяту. Іх таксама чакала паліцыя—польская жандармэрыя—але не для таго, каб іх абараняць ад мас! Не! Ім няма чаго баяцца мас—яны і ёсьць прадстаўнікі тае масы, ад якой паліцыя і жандармэрыя ахоўваюць міністраў, банкіраў і паліцэй-прэзыдэнтаў. Польская жандармэрыя чакала іх пры пераезьдзе савецка-польскае мяжы з зусім другою мэтай. Па адзаму падпарадкавалі вобмску маладых комсамольцаў, прымушалі нават разьдзяваць апошнюю кашулю—для таго, каб потым адабраць усё, што напамінае аб СССР—аб краіне будаўніцтва соцыялізму. Перш-наперш у іх адабралі комсамольскі сьцяг, а потым фотографіі, газэты, часопісы, бюсты Ільліча і г. д. Вось якую сустрэчу ім наладзіла польская жандармэрыя, нягледзячы на то, што гэта былі толькі транзытам праежджыя замежцы. (Калі гутарка ідзе аб комуністых, тады фашысты і ня думаюць лічыцца з інтэрнацыянальнымі конвэнцыям)!

Але аднаго паліцыя—нават рафініраваная польская жандармэрыя—ня здолела адняць у маладых комсамольцаў: іх пераконаньне, што тое, што адбываецца ў СССР ёсьць адзіны выхад для пролетарыяту, калі ён хоча вызваліцца ад рабства!

Разуменьне аб розьніцы дзьвёх сыстэм—разуменьне, якое комсамольцам і раней ня было чужым, гэта разуменьне ня выб'е з галавы комсамольцаў ніякая капіталістычная паліцыя!

„Нечакана" комсамольская дэлегацыя вярнулася назад—каб пасьпець яшчэ прыняць удзел у кампаніі народнага галасаваньня за роспуск саксонскага ляндтагу, 7 сьнежня ўвечары дэлегацыя ўжо была ў Лейпцыгу і выступала на сходзе комсамолу Лейпцыга к народнаму галасаваньню.

6 лістапада дэлегацыя пакінула Нямеччыну.

6 сьнежня дэлегацыя пераяжджала межы Нямеччыны назад. Адзін месяц!

Але у нямеччыне Брунінга ня толькі месяц, але і кожны дзень зьмяняе сытуацыю. Калі таварышы выяжджалі, у Нямеччыне было звыш 4 з паловай млн. беспрацоўных—а сёньня ўжо 5.060.000 беспрацоўных.

Гэтыя цыфры ўказваюць ня толькі на тое, што сотні тысяч пролетарыяў папалі ў армію галадаючых—гэта паказвае ў першую чаргу на штодзённае абвастрэньне крызісу, на штодзённае ўзмацненьне развалу капіталістычнай гаспадаркі Нямеччыны. І адпавед на экономічнаму развалу ўзмацняецца палітычная рэакцыя і тэрор буржуазіі, якая напружаньнем апошніх сіл жадае раздушыць нарастаючы рэволюцыйны крызіс. Комсамольцаў-дэлегатаў рабочай моладзі Саксоніі не чакалі з салютамі атрады фашысцкай паліцыі—іх чакала новая фашысцкая „абавязковая пастанова"—новыя надзвычайныя законы ўраду Брунінга, апублікаваныя 8 сьнежня. І толькі кароткі пераказ гэтых надзвычайных законаў, апублікаваных на 46 старонках (!), выстарчальны, каб зразумець абастрэньне палітычнага становішча ў Нямеччыне.

Надзвычайныя законы 1) дыктуюць зьніжэньне зарплаты да нормы 1927 г. г. зн. на 10-15 проц., зьніжэньне зарплаты чыноўнікам на 4 проц.! 2) адымаюць у 750000 рэнтнэраў—ахвяр вайны і капіталістычнай эксплёатацыі ўсякую дапамогу, г. зн. адымаюць усякія сродкі да існаваньня 3) забараняюць нашэньне ўніформ якіх-небудзь організацый, 4) забараняюць усе дэмонстрацыі і сходы з 9 сьнежня да 3-га студзеня,—але затое, 5) зьмяншаюць падаткі для капіталістых, 6) павялічваюць дапамогі для памешчыкаў, 7) уводзяць драконаўскія кары нават за „зьнявагу" чыноўнікаў, г. зн. паліцыі 8) павялічваюць кары за палітычныя злачынствы і г. д.

Буржуазія ведае, што гэта не вырашае пытаньня, але яна чапляецца як утапаючы за саломінку за гэтыя законы і іх вітае. Але нават буржуазная прэса павінна заявіць:

„Ёсьць прыстойныя хатнія гаспадыні, якія церпяць ад няправільнага погляду быццым з дамовых электрычных правадоў можна злабыць любую колькасьць току... і зьдзіўляюцца, калі выходзіць кароткае замыканьне току! У такім становішчы здаецца знаходзіцца ўрад Брунінга са сваім надзвычайным законам. Ён імкнецца занадта многа, „аднычасна і па ўсёй лініі" атрымаць са зьбядпелых дамовых праводаў нямецкай дзяржавы. І калі выйдзе кароткае замыканьне току—мы ня будзем зьдзіўляцца".

Вось гэтая сітуацыя і была ўрачыстай сустрэчай комсамольскай дэлегацыі. І гэта „ўрачыстая" сустрэча гаварыла адно:

—Рэбята! За работу!

Падрыхтоўвайце кароткае замыканьне току.

І ў першы-ж вечар свайго прыбываньня ў Нямеччыне комсамолец Вільгельм, з Плаўэна і былы член „СРМ„ —а цяперашні комсамолец—Гергард з Дрэздэна узяліся за работу—за агітацыю: супроць адной ўміраючай сыстэмы—за другую, новую пераможную сыстэму!

Вільгельм расказваў аб расчараваньні дэлегацыі ў байках падкупленай капіталістычнай прэсы Нямеччыны. Ён расказаў ня байкі, а толькі факты, толькі праўду, але гэтая праўда ўплывала больш, чым сотні баек. Ён раскзваў аб фабрыках, аб чырвоных дырэктарох і інжынэрах [у] Лейпцыгу адзін інжынэр заявіў [бас]туючым тэкстыльшчыцам: „Басту[йце,] памірайце з голаду! У нас жар[эш] сьвініна заўсёды будзе!), аб „гол[адзе]" у СССР, (а ў Нямеччыне беспра[цоў]ныя маюць магчымасьць „карыстац[ца]" перад калядными вітрынамі!) аб „[жа]ры" ДПУ над замежнымі дэлегацыя[мі,] якія прыяжджаюць у СССР, аб [не]мозе „пяцігодкі ў 4 гады", аб уда[рнай] брыгадзе сусьветнай рэволюцыі, [што] называецца—СССР!

Гергард—былы член соцыял-[дэмо]кратычнай організацыі моладзі,—[рас]казваў аб тых жахах, якія ён [за]бачыць у СССР па апавядан[ьнях] боні, і аб тых „жахах", якія ён [ба]чыў. Але гэтыя „жахі" зусім не [ўп]лыва ўплывалі. Наадварот—яны [[illegible]] столькі яго „жахнулі", што ён [за]явіў аб выхадзе з „СРМ" і ўступленьні [ў] комсамол!

Ён спадзяецца гэты „жах" усё[м] у другіх членаў „СРМ"—дзеля [таго,] каб узмацненьнем адзінага фр[онту] нямецкага пролетарыяту дабіцца [ра]ўнясеньня гэтых „жахаў" у Ня[меч]чыну.

Зусім звычайнымі словамі дэле[гаты] апавядалі аб бачаным і слышаным. І правільна зрабілі! Не патрэб[ны] фразы там, дзе д еяньні і факты [га]вораць самі за сябе!

Гэта быў пачатак! Ня гледзячы [на] тое, што да 3 студзеня усе паліц[эй]ды ў Нямеччыне забаронены, ком[са]мольская дэлегацыя наклапоціцца, [каб] праўда аб жыцьці рабочае мо[ладзі] СССР дайшла да самых далёкіх кутоў галадаючай Саксоніі. Тут ні[які] драконаўскія законы не памогуць! [Не] толькі словамі—а справай комсамольскія дэлегаты давядуць, што яны ўме[лі] ня толькі глядзець, але і бачыць [і на]вучыцца!

Рэбята, за работу! Нам нельга ба[яц]ца кароткага замыканьня току! [А] наадварот,—зацікаўлены ў кароткім замыканьні току!

Мы гэтага жадаем!

Мы гэтага дабёмся!

Комсамольцы Менску! [Вы] можаце быць у гэтым ўп[эў]нены.

Лейпцыг 9—XII-31 г.

Напярэдадні 4-га пленуму ЦК ЛКСМБ

У дні ўсесаюзнага сталінскага

ВЕДАЦЬ НУТРО ПАРАВОЗА!

Магілёўскія чыгуначнікі праводзяць тэхнічную конферэнцыю. За карэнны пералом змагаюцца комсамольцы 9-га вучастку цягі Гомеля. У перадавыя рады сталінскага паходу выходзяць чыгуначнікі Віцебску.

Выязныя рэдакцыі „Чырвонай зьмены“ — у Магілеве, Гомелі і Віцебску

За здаровы паравоз, за ўдарнае правядзеньне асеньня-зімовых перавозак, за карэнную перабудову усёй комсамольскай работы на транспарце змагаюцца выязныя рэдакцыі „Чырвонай зьмены“ на Віцебскім, Гомельскім і Магілеўскім вузлох.

Задача ў тым, каб у дні сталінскага паходу дабіцца поўнай ліквідацыі абязьлічкі вагонаў, поўнасьцю зьнішчыць зрывы спаранай язды, прынесьці к пленуму ЦК значны багаж бальшавіцкіх спраў.

Па паравозе „Комсамольская праўда“ Віцебскага вузла раўняйцеся ў вашай барацьбе — ён сьведчыць аб добрай працы сваіх гаспадароў—спараных брыгад.

Віцебск

На перадавыя лініі

Віцебскі чыгуначны вузел—важ[illegible] вузел БССР. Спыніся на хві[illegible] ток грузу—і прамысловы [illegible] не атрымаюць значную коль[illegible] продуктаў і сыравіны.

Вузел рос. Але рост соцыялістычнай гаспадаркі патрабуе ад яго працы большых, чым тэмпы росту. У выніку—значныя зрывы на вузьле.

[illegible] на 14 сьнежня [illegible] зрывы [illegible] 40 выпадкаў зрыву [illegible] толькі за 14 дзён!

[illegible] цягнікоў па раска[illegible] не дастае 50 [illegible] усіх адпраўленых цягнікоў. [illegible] за гэтыя паўтары дэкады [illegible] да 2 гадзін. Амаль кожны [illegible] засталося у сярэднім 20 [illegible] разгружаных вагонаў. [illegible] сустрэў зіму [illegible] снежныя заносы.

[illegible] дысцыпліна [illegible] Шмат прыкладаў не[illegible] безадказных адносін да [illegible] Так, па віне нарадчыка [illegible] паравоз сэрыі Э—3009 -ад-[illegible] 13 сьнежня абязьлічаным. [illegible] часта здараецца, што паасоб[illegible] рабочыя не выходзяць на пра[illegible] ранна настаўлена праца ў [illegible] Часта бывае патрэба ў паў[illegible] рамонце паравоза. Вось [illegible] комсамолец - машыністы [illegible] аб рамонце паравоза сэ[illegible] —432:

—Щ—432 10 кастрычніка стаў [illegible] на рамонт. Трэ' было агле[illegible] пярэднія паршнёвыя сальнікі [illegible] і левага боку, а таксама [illegible] залатонікі з левага боку Здае [illegible] рамантавал Але 20 кастрычніка [illegible] патрабавалася зьнішчыць па[illegible] правага, пярэдняга парш[illegible] сальніка. Зрабілі. 29-га [illegible] месяца зноў патрабуюць [illegible] таго-ж сальніка. Аднак, [illegible] яшчэ ня ўсё. Той-жа самы [illegible] адбываецца 30 кастрычніка [illegible] 11-га і 24 лістапада.

[illegible] яшчэ і такі выпадак, 24 [illegible] лістапада ў гэтым-жа паравозе трэ' [illegible] наставіць клапан задняму пра[illegible] ваму крану з левага боку, [illegible] мест зрабіць гэта, хтосьці [illegible] наваў:

—А ты здымі пакуль што кла[illegible] другога крану!

— У гэтага ці што? Узялі з [illegible] паравоза сэрыі Щ—438 клапан і [illegible] звілі паравозу 432. Клапан [illegible] след не падышоў, і не пась[illegible] паравоз выйсьці з дэпо як [illegible] клапан лопнуў...

Комсамол дэпо не паказаў свой твар у рабоце. Ніводная ячэйка ў дэпо не ставіла пытаньня аб арганізацыі і пераводзе брыгад на гаспадарчы разрахунак. У Віцебскім дэпо няма ніводнай гаспадарча-разрахунковай брыгады, не займалася пытаньнем ліквідацыі ўраўнілаўкі і палепшаньнем умоў працы рабочых.

Ячэйка руху фактычна ніякай работы не праводзіць, не займаецца пытаньнем маршрутызацыі, як гэта зусім ня цікавіць.

Зараз парт-арганізатар вылучыў свайго першага намесьніка для дапамогі і кіраўніцтва комсамольскай работай. Віцебскі гарком комсамолу вылучыў 3 адказных працаўнікоў і пры актыўным удзеле выязной рэдакцыі „Чырвонай Зьмены“, на вузьле вызначаецца здаровы пералом.

Комсамолія вузла ўключылася ў правядзеньне ўсесаюзнага сталінскага паходу. Па ўсіх цахавых ячэйках дэпо, у вагонных майстэрнях працуюць комсамольскія брыгады па пераводу на гаспадарчы разрахунак, на рамонтных работах ўжо арганізаваны і арганізуюцца ударныя комсамольскія брыгады, якія паўторнага рамонту не дапускаюць.

Комсамольцы паравозьнікі выклікалі на соцспаборніцтва рамонтныя брыгады і брыгаду руху. Праведзен сход—сустрэча паравозьнікаў з рамонтнымі брыгадамі дэпо.

Ячэйка руху па прыкладу комсамолу станцыі Ліхая, да пленуму ЦК ЛКСМБ рыхтуе першы маршрутны комсамольскі цягнік.

На вузьле праводзіцца першая тэхнічная конфэрэнцыя комсамолу, да правадзеньня якой прыцягнуты спэцыялістыя і старыя рабочыя.

Рэдакцыя газэты „За соцыялістычны транспорт“ сумесна з выязной рэдакцыяй „ЧЗ“ праводзіць масавы комсамольскі рэйд па рэалізацыі ўказаньняў Сталіна і загаду Андрэева.

Уся работа праходзіць пад сьцягам сталінскага паходу і падрыхтоўкі да пленуму ЦК ЛКСМБ. Комсамолія дабіваецца карэннага пералому у сваёй рабоце. Чым больш будзе дапамогі і сыстэматычнага конкрэтнага кіраўніцтва, тым хутчэй будзе зроблен гэты паварот!

Рашучыя крокі, якія робіць комсамол вузла, і разгорнутыя конкрэтныя мерапрыемствы могуць стаць прыкладам для ўсёй комсамолii чыгункі БССР.

Г. Фіялкін.

Гомель

Партыйныя, комсамольскія і профсаюзныя організацыі 9-га вучастку ня выкарысталі творчага ўздыму працоўных для практычнай рэалізацыі пастановы партыі і ўраду, а таксама ўказаньняў т. Сталіна. Тут нават не паклапаціліся скласьці конкрэтныя пляны, работа ідзе бясплянава, неорганізавана.

Комсамолія паказала багата прыкладаў ударнай работы, але комсамольскі колектыў вучастку не паказаў свайго твару, як моцнай працаздольнай організацыі. Шмат комсамольцаў на чале з опортуністычным кіраўніцтвам бюро, пры „мірным нагляданьні“ ГК ЛКСМБ, плялося ў хвасьце адсталае часткі рабочых, не змагалася за ўдарны транспорт.

Указаньні тав. Сталіна не пакладзены ў аснову работы комсамолу. У самыя гарачыя дні асеньня-зімовых перавозак адчуваецца значнае пагоршаньне паасобных паказчыкаў работы дэпо ў параўнаньні з летнімі месяцамі.

За апошні час заўважваецца рост несвоечасовай падачы паравозаў к цягнікам, участіліся выпадкі астановкі цягнікоў з-за псаваньня паравозаў. Ва ўсім гэтым не адчуваўся комсамол як ініцыятар, як сапраўдны ўдарнік.

Кіраўніцтва адноўлена. Зараз на вучастку працуе оргтройка Гаркому комсамолу разам з выязной рэдакцыяй „ЧЗ“. Апошнія дні вызначаюць пералом у рабоце. За гэта гаворыць актыўны ўдзел комсамольскага колектыву ў перабудове комсамольскай работы па-новаму. За гэта гаворыць падрыхтоўка, якая разгортваецца да пленуму ЦК ЛКСМБ. К пленуму комсамол 9-га вучастку можа прыйсьці з перамогай і, пры ўдарнай рабоце, ён прыйдзе.

Цішка Верны.

ГОМЕЛЬ 19. (Па тэлефону). У дэпо 9-га вучастку разгортваецца работа па перабудове комсамольскай работы. Перабудавана работа ячэйкі паравозьнікаў. 18-га сьнежня комсамол прыступае да рамонту паравоза для падарунку пленуму.

Комсамольская ячэйка дэпо ў парадку падрыхтоўкі да пленуму адрамантавала адзін вагон і рамантуе другі.

Комсамольскія паравозы дэпо Гомель змагаюцца за першынства спараных брыгад ва ўсесаюзным конкурсе, абвешчаным ЦО партыі газэтай „Праўда“.

На Гомельскім чыгуначным вузьле організуюцца контрольныя комсамольскія пасты, якія будуць сачыць за своечасовай падачай цягнікоў к паравозам, за добраякасным рамонтам і маршрутызацыяй.

Магілеў

Дзеньнік

выязной рэдакцыі

* Бюро сэкцыі ІТР адобрыла ініцыятыву выязной рэдакцыі бюро колектыву аб склікаваньні тэхнічнай конфэрэнцыі. На бюро распрацавалі плян падрыхтоўкі і правядзеньня конфэрэнцыі, якая разьлічана на 2 дні.

У першы дзень конфэрэнцыя заслухае даклад спэцыялістага аб соцыялістычнай рэконструкцыі транспорту, другі дзень будуць працаваць сэкцыі па рамонту паравоза, руху і тэхнікі шляхоў. На чале кожнай сэкцыі стаіць член ІТР. Да конфэрэнцыі выпускаецца спэцыяльны нумар газэты. Конфэрэнцыя пачне сваю работу 23 сьнежня.

* Брыгада паравозьнікаў гутарыла з начальнікам дэпо т. Гарашчэнка аб стане ўкараненьня гаспадарчага разрахунку. Высьветлілася, што выкананьне гаспадарча-разрахунковых дагавароў, вынікі гаспадарчага разрахунку, па распараджэньню дырэкцыі дарог падводзяцца ад абточкі да абточкі, ня гледзячы на ўсе магчымасьці наладзіць рэгулярны штомесячны вучот выкананьня гаспадарча-разрахунковых дагавароў.

Па прапанове выязной рэдакцыі райком комсамолу пасылае на чыгунку двух разрахунковых працаўнікоў а комсамольскі колектыў устанаўляе свой кантроль за ходам выкананьня дагавору.

* Організован комсамольскі паравоз № 5888. Вылучаны 2 комсамольскія брыгады. Гэтымі днямі адбудзецца нарада брыгад, на якой будзе заключан гаспадарча- разрахунковы дагавор. На паравозе будзе выпускацца штодзёнка.

У барацьбе за гаспадарчы разрахунак

[illegible] ынаючы з ліпеня, ударныя бры[illegible] дэпо настойліва патрабавалі аб [illegible] ерадзе іх на гаспадарчы разрахунак, [illegible] днак адміністрацыя ўвесь час [illegible] зрывала справу, сыстэматычна адкладаючы перавод брыгад.

[illegible] з комсамольскі комітэт склікаў спэцыяльнае паседжаньне бюро па [illegible] пытаньню пераводу ўдарных брыгад на [illegible] падарчы разрахунак. На нарадзе [illegible] начальнікам дэпо і яго намесьніка [illegible] гэта пытаньне было пастаўлена [illegible] рубам.

[illegible] начальнік дэпо. так, і асабліва яго [illegible] намесьнік т. Ягораў настойліва [illegible] давілі немагчымасьць пераводу брыгад зараз, кажучы што гэта магчыма зрабіць не раней лютага 1932 году. Больш таго высьветлілася, што дэпо працуе без усялякага пляну, у [illegible] сьляпую.

Адміністрацыя дэпо, нягледзячы на катэгарычныя загады НКШЗ аб пераводзе ўсіх адзінак транспорту на гаспадарчы разрахунак, яўна ігнаруе гэтыя загады, прыкрываючыся рознымі аб'ектыўнымі прычынамі.

Гэтыя довады не атрымалі своечасовага рашучага адпору.

Зараз першаю пераводзіцца на гаспадарчы разрахунак комсамольская брыгада меднікаў, рыхтуюцца да пераводу астатнія комсамольскія брыгады. Комсамольскі камітэт вылучыў 3 лепшых ударнікаў з вытворчасьці ў апарат дэпо непасрэдна на работу па гаспадарчаму разрахунку.

Комсамол Віцебскай чыгункі робіць рашучы крок у барацьбе за гаспадарчы разрахунак, Уперадзе яшчэ багата барацьбы з закаранеласьцю опортуністычнымі адносінамі паасобных гаспадарнікаў да гасразрахунку.

Неабходна рашуча змагацца з усялякімі спробамі сарваць увядзеньне гаспадарчага разрахунку, спробы ігнараваць дырэктывы партыі па аздараўленьню чыгуначнага транспорту павінны атрымаць рашучы адпор.

Фіялкін, Малей, Бэрлін

Творчы агляд маладзёжнай літаратуры

За „вобраз-прыклад“,

за баявое супрацоўніцтва комсамолу з БелАПП

Прыступайце да разгортваньня агляду

Пастанова ўсебеларускай нарады загадчыкаў аддзелаў культуры і адукацыі РК ЛКСМБ аб творчым аглядзе маладзёжнай літаратуры (зацьверджана ЦК ЛКСМБ ад 17 сьнежня 1931 году)

1. Падтрымліваючы ініцыятыву „Комсамольскай праўды“ і выходзячы з пастаноў ЦК Усе ЛКСМ аб вытворчым аглядзе маладзёжнай літаратуры, нарада лічыць, што творчы агляд маладзёжнай літаратуры ва ўмовах БССР набывае вялізарнае значэньне таму, што беларуская пролетарская літаратура, як і іншых атрадаў пролетарскіх літаратур СССР ня гледзячы на свой колькасны і якасны рост, не стварыла вобразу станоўчага гэроя нашай эпохі, „образа-примера“, недастаткова павярнулася тварам да комсамолу, да комсамольскай тэматыкі. Таму лічыць неабходным побач з удзелам у творчым аглядзе твораў высунутых „Комсомольской Правдой“ (М Платошкін—„Отец“, „Прорыв“, М. Коласаў В. Герасімаў—„Проба“, А. Ісбах—„Пароде“, Б. Галін—„Переход“ А. Мітрофанаў—„Июнь-Июль“, Караваева—„Крутая ступень“, Н. Багданаў—„Вызов“, „Твердой поступью“, Я. Шведаў—„Повести о волчьем братстве“, Б. Гарбатаў—„Наш горад, Б. Левін—„Жили два товарища“, Овалаў—„Путь в завтрашний день“, зборнікі вершаў Бязыменскага, Жарава, Малчанава, Ахтаўзэна, Уткіна, Суркова),— падтрымаць ініцыятыву „Чырвонай зьмены“ аб правядзеньні творчага агляду маладзёжнай беларускай пролетарскай літаратуры і літаратуры нацменшасьцяў, у прыватнасьці твораў: Александровіч—„Напор“, „Вершы і поэмы“, М. Чарот—„Сонечны паход“, П. Галавач—„Вінаваты“, „Спалох на заговах“, П. Броўка—„Цэхавыя будні“, „Каландры“, М. Лынькоў—„Апошні зьверыядавец“, „Андрэй лятун“ В. Каваль—„Ілька“, „Жніво“, С. Ліхадзіеўскі—„Рокаты дальняе прыстані“, Б. Мікуліч—„Наша сонца“. „Удар“, П. Трус—„Дзесяты падмурак“. Хв. Шынклер—„Ічэ“, С. Знаёмы—„За дамбаю“, твораў ударнікаў заклікаых у літаратуру („Ударнік“ і інш.). Адобрыць ініцыятыву „Юнгер Арбэйтэр“ аб аглядзе яўрэйскай маладзёжнай літаратуры—твораў Харыка, Фефера, Кушнярова, Котлер. Юдэльсона, Вайпэрмана, Грынзай, Янкелевіча. Разгарнуць агляд польскай маладзёжнай пролетарскай літаратуры—твораў Гараўскага, Рымашэўскага і інш.

2. Нарада лічыць, што толькі пры ўмове прыцягненьня шырокай пролетарскай грамадзкасьці, у першую чаргу комсамольскай організацыі, на аснове конкрэтнай творчай крытыкі магчыма будзе пасьпяхова правесьці гэты агляд, выявіць адхіленьні і памылкі, промахі таго ці іншага пісьменьніка, што зьявіцца лепшай дапамогай пролетпісьменьнікаў у іх творчай рабоце, зьявіцца сродкам яшчэ большага збліжэньня комсамолу з БелАПП.

3. Комсамольскім організацыям неабходна зараз-жа разгарнуць належную работу вакол агляду, шляхам абгаварэньня на сходах ячэек з удзелам працоўнай моладзі пытаньняў становішча беларускай пролетарскай літаратуры, задач перабудовы літаратурных організацый у сьвятле прайшоўшай дыскусіі паміж комсамолам і РАПП, выступленьня Косарава на пленуме ЦК ЛКСМУ, апошняга рашэньня пленуму РАПП'а. Гэта масавая работа павінна суправаджацца ўзмацненьнем кіраўніцтва літгурткамі узмацненьнем работы па заклікy ўдарнікаў у літаратуру.

4. Сконцэнтраваць асноўнае кіраўніцтва аглядам пры „Чырвонай зьмене“. Рэдакцыі „Чырвонай зьмены“ неабходна скласьці групу пролетарскіх пісьменьнікаў і крытыкаў, склаўшы з іх літбрыгаду, якая зьвязаўшыся з літгурткамі на прадпрыемствах і шырокай пролетарскай грамадзкасьцю павінна дапамагчы мясцовым організацыям ЛКСМБ у правядзеньні творчага агляду. Аднак, концэнтрацыя кіраўніцтва агляду пры „Чырвонай зьмене“ не азначае зьняцьця адказнасьці і кіраўніцтва з камітэтаў і ячэек, а наадварот—асабліва Менск, Віцебск, Гомель, Бабруйск і інш. організацыі, дзе існуюць філіі БелАПП'а павінны таксама скласьці літаратурныя брыгады для конкрэтнага правядзеньня агляду, прыцягнуўшы да яго мясцовы друк.

5. Комсамольская ячэйка пісьменьнікаў у гэтым аглядзе павінна адыграць вялікую ролю ў справе мобілізацыі і прыцягненьня пісьменьніцкіх мас да агляду, разгортваньня гэтага агляду на прадпрыемствах. Высоўваючы з сваіх шэрагаў організатараў і кіраўнікоў літгурткамі, беручы непасрэдны ўдзел у гэтым аглядзе, ячэйка яшчэ больш узмацніцца, пашырыць свой уплыў на беспартыйны пісьменніцкі маладняк яшчэ больш узброіцца марксысцка-ленінскай тэорыяй яшчэ больш разгорне творчую дыскусію.

6. Лічыць неабходным творчы агляд правесьці да 1 Мая 1932 году. Для кіраўніцтва аглядам скласьці цэнтральны штаб у складзе т. т. Рубінчык, (ЦК ЛКСМБ), Галавач, Пэрліна, Анісаў, Александровіч, Фрумкіна, Вайнштэйн, Бэнлэ, Бронштэйн, Ліхадзіеўскі, Лынькоў.

НЕАДКЛАДНА УКЛЮЧЫЦЦА

Комсамолія фабрыкі „Спартак“ (Шклоў) слабы ўдзел прымае ў нацыянальна культурным будаўніцтве.

Ніякай работы вакол задач пролетарскага літаратурнага руху тут не разгорнута. Значэньне заклiку рабочых-ударнікаў у літаратуру не популярызавана на заводзе. Комсамольскі колектыў „Спартака“ яшчэ нічога не зрабіў у гэтым напрамку. Шматтыражка „Голас спартакаўца“ ніводнага слова не напісала пра заклік ударнікаў у літаратуру. Работа бібліотэкі знаходзіцца ўвесь час у занападзе. Новай літаратуры няма. Зусім нязначная колькасьць беларускай мастацкай літаратуры.

Гурткі, якія існуюць пры бібліотэцы, не працуюць. За ўвесь час існаваньня бібліотэкі ня было наладжана ніводнага разгляду твораў пролетарскай літаратуры, ніводнага дакладу аб значэньні пролетарскай літаратуры. Рабочы чытач мала прыцягнуты да бібліотэкі.

Зараз газэтай „Чырвоная Зьмена“ разгортваецца творчы агляд літаратуры. Комсамолія „Спартака“ павінна ўключыцца ў гэты агляд. Тое самае павінна зрабіць і шматтыражка. На фабрыцы трэба разгарнуць заклік ударнікаў у літаратуру.

Эд. Манцэвіч.

Пакласьці канец буржуазна-месьніцкай практыцы

Саўгасны сэктар БССР плян збожжазагатовак значна недавыканаў. Асобныя саўгасы правальваюць хлебаздачу. Саўгас „Самуэлева“ у выніку буржуазных спажывецкіх тэндэнцый праваліў здачу збожжа: заданьне 1250 цэнтн.—здаў 120. Ураджай аўса разбазарваўся, скармліваўся конямі. Ураджай пшаніцы цалкам скарыстаны для сваіх патрэб, дзяржаве нічога не здадзена. Такое становішча і ў саўгасе „Цітва“, Пухавіцкага раёну.

Саўгасы „Лінова“ (Мазырскі раён), „Забычаньне“ (Касьцюковіцкі раён), „Астрагляд“ (Брагінскі раён) не здалі дзяржаве ніводнага цэнтнера збожжа. Саўгас „Астрагляд“ 50 цэнтн. вызначанай для здачы пшаніцы разьмеркаваў для ўласнай патрэбы, а саўгас „Загараны“ катэгорычна адмовіўся здаць хоць-бы 1 цэнтн. Лепшым доказам таго, што такія безпадстаўныя заявы ўзьнікаюць толькі на глебе буржуазна-спажывецкіх тэндэнцый, зьяўляецца выкананьне і перавыкананьне дзесяткамі саўгасаў сваіх заданьняў па збожжу. Саўгас „Рудакова“ Хойніцкі раён) выканаў сваё заданьне на 115 проц., а такіх саўгасаў шмат.

Недавыкананьне пляну па трэсту „Сьвінавод“ хаваецца ў скрытым і адкрытым сабота́жы здачы збожжа. Дырэктар саўгасу „Райцы“ (Талочынскі раён) т. Рашэтнікаў аддаў загад не здаваць дзяржаве ніводнага цэнтнера збожжа. Саўгас „Шыкатовічы“ (Койданаўскі раён) замест 370 цэнтн. здаў усяго 180.

(БЕЛТА)

Хваля абурэньня студэнцкіх мас супроць здрадніцкай палітыкі Гоміндану

Гоміндан жорстка распраўляецца з дэманстрантамі

ШАНХАЙ. Сёньня 3000 студэнтаў у Нанкіне атакавалі памяшканьне цэнтральных органаў Гоміндану.

Выкрыкваючы антыгоміндэнаўскія лёзунгі, студэнты пачалі зьнішчаць усё абсталяваньне ў памяшканьні Гоміндану. Атрад салдат мясцовага гарнізону разагнаў студэнтаў. Аднак, праз нейкі час студэнты зноў сабраліся каля будынку рэдакцыі афіцыйнага органу нанкінскага ўраду „Сэнтрал дэйлі вьюс“ супрацоўнікі рэдакцыі своечасова забарыкадавалі ўсе дзьверы. Нягледзячы на гэта супраціўленьне, студэнты разьнесьлі некалькі рэдакцыйных габінэтаў, пашкодзілі друкарскія машыны. Паліцыя і салдаты адкрылі агонь. К месцу сутычкі прыбылі 5 бронемашын з войскамі. Звыш 30 студэнтаў арыштавана, 6 студэнтаў паранены і вынесены сваімі таварышамі. Калі к месцу сутычкі прыбыла новая дружына студэнтаў нанкінскага ўнівэрсытэту, войскі зноў адкрылі агонь. Лік пацярпеўшых невядомы.

У час нападу студэнтаў на памяшканьне цэнтральнага камітэту Гоміндану забіты адзін член ЦК Гоміндану.

„Гоміндан не павінен кіраваць краінай“

У Нанкіне адбыўся экстраны студэнцкі мытынг, на якім прынята рашэньне:

„Гоміндан не павінен кіраваць краінай“. Студэнты парашылі таксама сустрэць на вакзале кантонскіх лідэраў, якія прыяджаюць у Нанкін, і прымусіць іх прыняць гэта патрабаваньне.

Раніцай некалькі тысяч салдат нанкінскага гарнізону акружылі памяшканьне ўнівэрсытэту, дзе знаходзіліся бэйпінскія, дзінаньскія, цзяньцінскія і шанхайскія студэнты, захапілі іх і пад канвоем адправілі ў спэцыяльныя цягнікі, раней падрыхтаваныя для адпраўкі студэнтаў па дамох.

Гоміндэнаўскія войскі адкрылі агонь па студэнтах

БЭПІЙН. У знак протэсту супроць 3-х месячнай окупацыі Манчжурыі, 5 тысяч студэнтаў у Тайюане назладзілі дэманстрацыю. Дэманстранты падышлі да будынку мясцовага аддзелу Гоміндану і патрабавалі зьняць з пасады гоміндэнаўскіх чыноўнікаў. Гоміндэнаўскія атрады, якія ахоўвалі будынак, адкрылі агонь па студэнтах. 2 студэнты забіты і шмат паранена. Пад націскам студэнтаў мясцовыя ўлады арыштавалі 6 гоміндэнаўскіх чыноўнікаў, вінаватых у страляніне. У выніку студэнцкіх непарадкаў парушан рух па Цзяньцзінь-Пухоўскай чыгунцы.

Папярэдняя дрэсыроўка

Дэтэрдынг прымае актыўны ўдзел у справах рускіх белагвардзейцаў і заклікае белагвардзейскую моладзь быць падрыхтаванай к выступленьню супроць СССР.

(З газэт)



Японія рыхтуецца да захопу Цзіньчжоў

ТОКІЁ. Па паведамленьню агенцтва „Сімбун рэнго“ з Мукдэна, квантунская армія (японская окупацыйная армія) парашыла прагнаць з Манчжурыі „бандытаў“, якімі кіруе Чжан-Сюэ-Лян. З гэтай мэтай квантунская армія прыступіць на днях „да ачысткі“ раёну паміж вялікай сьцяною і ракою Ляо. Старшыня праўленьня ПМ.чыг. Уціда, які меркаваў выехаць у Токіё 19 сьнежня адклаў падарожжа на тыдзень у сувязі з надыходзячымі падзеямі. У колах ПМчыг. указваюць, што Уціда ня мае намеру падаць у адстаўку пакольні праўленьне ПМ чыг. лічыць, што у даны сур'ёзны момант нельга мяняць кіраўніцтва ПМ чыг. у выпадку, калі сэйюкайскі ўрад (новы ўрад Японіі) будзе настойваць, адстаўка пасьледуе толькі праз некалькі месяцаў.

„Сімбун рэнго“ паведамляе з Мукдэна, што камандваньне квантунскай арміі парашыла прад'явіць Чжан-Сюэ-Ляну ультыматыўнае патрабаваньне аб эвакуацыі кітайскіх войск з Цзіньчжоу у пэўны тэрмін. Калі Цзян-Сюэ-Лян адхіліць ультыматум, квантунская армія сілай „адхіліць“ цзіньчжоўскія войскі. Чакаюць, што ваеныя дзеі супроць Цзіньчжоў пачнуцца 25 сьнежня, пасьля таго як прыбудуць новыя буйныя папаўненьні з Японіі.

Па паведамленьню агенцтва „Сімбун рэнго“, аддадзены загад аб мобілізацыі частак 5 дывізіі японскіх войск у горадзе Хірошымо і адпраўцы іх у манчжурыю.

Абстрэл японскімі самалётамі Тунляо

ШАНХАЙ. 5 японскіх самалётаў зьявіліся над Тунляо і скінулі 39 бомб.

З краіны, дзе беспрацоўе, тэрор, падрыхтоўка вайны

Новыя факты ваеннай падрыхтоўкі польскага фашызму

За апошні час адчуваецца ліхаманкавая ваенная падрыхтоўка польскага фашызму.

Пасьля таго, як быў ухвалены закон аб мілітарызацыі чыгункі, польскі сойм гэтымі днямі ўхваліў закон, на падставе якога ствараецца ў польскай арміі катэгорыя падофіцэраў, якое да гэтага часу яшчэ ня было. Гэта зроблена з тэй мэтай, каб стварыць фашысцкія кадры ваенных спэцаў, якія былі-б апорай фашысцкага ўраду для прыдушэньня рэволюцыйнага руху сярод арміі і для падрыхтоўкі карных атрадаў.

Апрача гэтага, прэзыдэнт Польшчы зацьвердзіў распараджэньне вайсковага міністэрства, на падставе якога 6 палкоўнікаў пераводзяцца ў генэралы і 27 падпалкоўнікаў у палкоўнікі. Гэтыя назначэньні датычаць галоўным чынам Зах. Беларусі, дзе фашысцкі ўрад імкнецца ўзмацніць свае ваенныя сілы на выпадак вайны з Савецкім Саюзам.

Бурная дэманстрацыя беспрацоўных у Лодзі

„Ілюстраваны кур'ер цодзенны“ паведамляе, што гэтымі днямі ў Лодзі, перад будынкам магістрату, адбылася бурная дэманстрацыя сэзонных рабочых, якія дамагаліся ад ураду дапамогі. Ад дэманстрантаў у магістрат была выслана дэлегацыя, якую, аднак, прэзыдэнт гораду прыняць адмовіў. На такую вестку дэманстранты пачалі протэставаць, выклікаючы варожыя ўраду лёзунгі і дамаганьні дапамогі.

Зараз-жа зьявіўся моцны атрад паліцыі, які пачаў разганяць дэманстрацыю. Некалькі асоб арыштаваны.

Нясупынны рост беспрацоўя ў Польшчы

Нягледзячы на ўсе мерапрыемствы фашысцкага ўраду, беспрацоўе ўсёй Польшчы шпаркім тэмпам павялічваецца. Ня так даўно фашысцкія газэты паведамлялі, што ў Польшчы налічваецца 250 тысяч беспрацоўных. Цяпер ужо газэты сьцьвярджаюць, што беспрацоўных ужо ў даны момант налічваецца 268,137 асоб. У параўнаньні з мінулым тыднем, беспрацоўе ўзрасло на 6173 чал.

Далей газэты паведамляюць, што ў сувязі з масавым зачыненьнем фабрык і заводаў беспрацоўе ўзрастае з кожным днём.

Рыхтуюць грунт для крывавых дзеяньняў

ТОКІЁ 18. Японскае агенцтва „Сімбун рэнго“ паведамляе з Чан-Чуня аб значным узмацненьні актыўнасьці „бандытаў“ у паўночнай частцы зоны ПМ чыг. Мяркуюць, што японскі гарнізон у Сыпінгаі заўтра-ж пачне ваенныя дзеі ў шырокім маштабе.

Конкурс нізавога друку

Конкурсу „Праўды“ — бальшавіцкія тэмпы

Цьвёрдае партыйнае кіраўніцтва нізавому друку саўгасаў, колгасаў, МТС

Вушацкі і Шклоўскі райкомы КСМ павінны ліквідаваць ганебнае адставаньне

Рад камітэтаў і ячэек КСМ Вушацкага і Шклоўскага раёнаў самым ганебным чынам бязьдзейнічае ў разгортваньні сапраўды ўдарнай работы па абвешчанаму ЦО „Праўдай“ конкурсу, што зьяўляецца яўнай праваопортуністычнай практыкай у барацьбе за організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў.

Пастанова ЦК КП(б)Б аб усесаюзным конкурсе нізавога друку павінна стаць пуцёўкай і конкрэтнай програмай для ўсіх комсамольскіх організацый у распрацоўцы практычных мерапрыемстваў, якія-б забясьпечылі поўнае выкананьне пастаноў ЦК аб нізавым друку і рабсэлькораўскім руху.

Вопыт барацьбы комсамоліі Койданаўшчыны за организацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў, асьветлены на старонках „Чырвонай Зьмены“ за 20 сьнежня павінен стаць прыкладам для ўсіх організацый КСМ.

У баку ад жыцьця

На тэрыторыі Чарноўшчынскага с-с, Вушацкага раёну, існуе ўсяго адна насьценгазэта—у колгасе „Бязбожнік“. Належнага партыйнага кіраўніцтва газэта не атрымлівае, а таму і не займаецца асноўнымі вядучымі пытаньнямі колгаснай гаспадаркі. Газэта ні разу не завастрыла ўвагі на датэрміновую і своечасовую апрацоўку лёну і здачу яго дзяржаве, на выкананьне іншых відаў нарыхтовак. Такім чынам барацьба за організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў ня стала адпраўным пунктам у працы газэты. Рэдколегія і комсамольская ячэйка не разгарнулі належнай работы сярод селькораў і юнкораў. Матар'ялы паступаюць слаба і газэта ня можа выходзіць рэгулярна.

РК КСМ павінен зьвярнуць асаблівую ўвагу на разгортваньне работы з юнкорамі, намеціць конкрэтныя мерапрыемствы па конкурсу нізавога друку, дабіцца рэгулярнага выхаду насьценгазэт.

Юнкорбрыгада: Віньнік, Маркевіч, Урбан, Дук, Талочка.

Выйсьці з тылу

Насьценгазэты саўгасаў і колгасаў адыгрываюць вялізарную ролю ў мобілізацыі рабочых і колгасных мас на організацыйна-гаспадарчае замацаваньне колгасаў.

У Колгасе „Барэц“ (Клімавіцкі раён, Забышанскі с-с) ня выходзіць насьценгазэта. Рэдколегія опортуністычна бяздзейнічае. Ніякай культмасавай работы сярод колгасьнікаў не праводзіцца. Важнейшая політычнае мерапрыемства, на якое зараз організоўваюцца ўсе колгасныя масы—конкурс нізавога друку—праходзіць па-за ўвагай колгасу.

Комсамольская ячэйка павінна зацікавіцца працай рэдколегіі і разам з ёю організаваць разгортваньне конкурсу нізавога друку па організацыйна-гаспадарчым умацаваньню колгасаў.

Сідарэнка.

„Няма калі займацца распрацоўкай пастаноў“

Пастановы 2-га рабсельваенкораўскага зьезду ў Мусіцкім с-савеце, Слуцкага раёну не рэалізуюцца.

Партыйныя і комсамольскія організацыі мала ведаюць аб гэтых пастановах, як і аб самым зьезьдзе. Тым часам насьценгазэта колгасу рэгулярна ня выходзіць. Часта можна пачуць такія опортуністычныя разважаньні прадстаўнікоў масцовых організацый: „Цяпер няма часу займацца распрацоўкай пастаноў, у нас іншыя гаспадарчыя кампаніі, а вы гаворыце аб нейкім там зьезьдзе“.

Брыгада „ЧЗ“
Бранавец Статкевіч.

Шклоўская комсамолія ганебна адстае

Комсамольская організацыя сама не прапрацавала вывікаў 2 Ўсебеларускага зьезду рабсэлькораў, дзякуючы чаму комсамольскія яч-кі стаяць у баку ад разгортваньня і ўзмацненьня нізавога друку.

Аднак, трэба адзначыць, што раённая газэта „Прамень комунізму“ шырока разгарнула работу па правядзенню конкурсу. Склікаюцца кустовыя нарады рабсэлькораў. Дзякуючы добра разгорнутай рабоце газэтай уся рабсэлькораўская армія па-сапраўднаму мобілізавалася на ўнутрыгаспадарчае ўмацаваньне колгасаў і выкананьне гаспадарча-політычных кампаній.

Комсамольская організацыя, мобілізуючы ўсю беспартыйную сялянска-колгасную моладзь на ўнутрыгаспадарчае ўмацаваньне колгасаў, павінна конкрэтна дапамагчы раённай газэце ў яе мерапрыемствах.

Юр. Загорскі.

Адказны рэдактар Л. ПЭРЛІНА

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна

Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2522.